# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

УДК 37.01:378.4:[008+7]

*А. А. Корбут*

## Асаблівасці рэалізацыі практыка-арыентаванага навучання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў

*Разглядаюцца працэсы рэфармавання айчыннай вышэйшай адукацыі на прыкладзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, падкрэсліваецца роля практыка-арыентаванага навучання ў падрыхтоўцы спецыялістаў, канкурэнтаздольных на сучасным рынку працы. Адзначаецца, што выпускнікі БДУКМ маюць унікальную магчымасць прымяніць атрыманыя веды на практыцы ў лепшых установах краіны.*

*Раскрываецца актуальнасць выбранай тэмы, аналізуюцца навуковыя падыходы, якія склаліся ў педагогіцы, да практыка-арыентаванага навучання.*

У сувязі з ростам запытаў сацыяльна-культурнай сферы ў кадрах высокай кваліфікацыі сёння да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў прад’яўляюцца ўсё больш жорсткія патрабаванні як з боку работадаўцаў, так і з боку дзяржавы і саміх студэнтаў.

Асноўны вектар дзейнасці БДУКМ накіраваны на выхаванне асобы, узровень кампетэнтнасці, адказнасці якой адпавядае еўрапейскім і сусветным стандартам. Асвойванне і рэалізацыя інавацыйнай мадэлі адукацыі, арыентаванай не столькі на перадачу ведаў, якія хутка робяцца састарэлымі, колькі на фарміраванне шырокага спектра кампетэнцый, што дазволяць прафесійна і асобасна развівацца як падчас навучання, так і на працягу ўсяго жыцця, абумоўлівае неабходнасць забеспячэння цеснай сувязі з практыкай.

У адрозненне ад некаторых іншых устаноў вышэйшай адукацыі (УВА), дзе разам з высокім тэарэтычным узроўнем традыцыйнай адукацыі прасочваецца адарванасць атрыманых ведаў ад прымянення на практыцы, у БДУКМ практыка-арыентаваны падыход з’яўляецца асноватворным.

У адукацыйных стандартах вышэйшай адукацыі адлюстраваны патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі і фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый выпускніка УВА, тэндэнцыі ўзмацнення приклад-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нога, практычнага характару навучання, адэкватнага сучаснаму стану эканомікі, навукі, сацыякультурнай сітуацыі ў краіне і свеце. Аднак у тэарэтычных і метадычных распрацоўках змест і формы практыка-арыентаванага навучання яшчэ дасканала не разгледжаны. Па-за межамі праблемнага поля педагагічнай тэорыі і практыкі застаюцца сутнасныя характарыстыкі прафесійнага станаўлення будучых спецыялістаў у сферы культуры. Не атрымала дастатковага тэарэтычнага абгрунтавання інавацыйная адукацыйная мадэль, рэалізацыя якой магла б забяспечыць павышэнне якасці падрыхтоўкі.

Адзначаныя пытанні абумоўліваюць актуальнасць дадзенага артыкула і вызначэнне яго *мэтанакіраванасці:*

– выяўленне асноўных прынцыпаў функцыянавання практыка-арыентаванага адукацыйнага асяроддзя на прыкладзе БДУКМ;

– вылучэнне перспектыўных напрамкаў развіцця практыка-арыентаванага навучання;

– даследаванне яго ўплыву на станаўленне, рэалізацыю, раскрыццё, самаўдасканаленне індывідуума.

Вылучым падыходы, якія склаліся ў педагагічнай навуцы, да практыка-арыентаванага навучання спецыялістаў.

Найбольш вузкі падыход звязвае практыка-арыентаванае навучанне з фарміраваннем прафесійнага вопыту студэнтаў пры ўключэнні іх у сацыякультурную дзейнасць падчас вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі [4; 10].

Другі падыход, адлюстраваны ў працах У. Бяспалька [2], А. Вярбіцкага [3], Т. Дзмітрыенка [5], А. Панфілавай [7], Г. Селяўко [9], прадугледжвае выкарыстанне прафесійна арыентаваных тэхналогій навучання і методык мадэлявання фрагментаў будучай прафесійнай дзейнасці на падставе выкарыстання магчымасцей кантэкставага вывучэння не толькі профільных, але і няпрофільных дысцыплін [1].

Трэці, найбольш шырокі падыход, які грунтоўна сфармуляваў Ф. Ялалаў [11], увасоблены ў дзейнасна-кампетэнтнаснай парадыгме [8].

Аналіз дзейнасці БДУКМ паказвае, што практычная арыентаванасць прафесійнага навучання мае прынцыповы характар у падрыхтоўцы спецыялістаў сферы культуры, што выяўляецца ў шэрагу асаблівасцей, з якіх найбольш важнымі з'яўляюцца наступныя:

– агульная колькасць гадзін, адведзеных на практычную адукацыю, складае да 50 % часу навучання;

– выкарыстоўваюцца крэатыўныя метады (метад праблемна-арыентаванага навучання, метад праектаў і інш.);

– навучанне арыентуецца на працу ў групе, камандзе;

– адбываецца інтэграцыя вучэбных дысцыплін як «спосаб набліжэння» вучэбнай (аўдыторнай) сітуацыі да рэальнай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ствараецца цэласнае ўяўленне аб будучай прафесійнай дзейнасці і яе буйных фрагментах;

– большасць універсітэцкіх выкладчыкаў мае значны вопыт сацыяльнай работы, і, працягваючы выкладаць, пастаянна звяртаецца да практычнай дзейнасці, якая разглядаецца як крыніца павышэння кваліфікацыі, прафесійнага майстэрства.

Калі параўноўваць дзейнасць універсітэта з вопытам работы еўрапейскіх вышэйшых навучальных устаноў [6], то відавочна, што ў БДУКМ выкарыстоўваюцца ідэнтычныя прынцыпы арганізацыі навучальнага працэсу.

Найбольш ярка прынцыпы навучання, арыентаванага на практыку, рэалізуюцца на факультэтах музычнага мастацтва, традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, у структуру якіх уваходзяць «творчыя» кафедры. На гэтых кафедрах адукацыйны працэс пабудаваны на раннім (з першага курса) далучэнні студэнтаў да практыкі ў сферы мастацтва. Акрамя таго, на большасці кафедр універсітэта студэнты атрымліваюць кваліфікацыю «выкладчык», што абумоўлівае неабходнасць асваення імі педагагічнай навукі і, адпаведна, далучэння да вырашэння актуальных педагагічных задач.

Будучаму спецыялісту ў сферы сацыяльна-культурнай дзейнасці важна ўсвядоміць практычную значнасць вучэбнага матэрыялу, зразумець перспектывы прафесіі, убачыць узоры сапраўднай творчасці, авалодаць новымі тэхналогіямі, уяўляць магчымыя цяжкасці і быць гатовым да іх пераадолення. У гэтым заключаецца асноўнае прызначэнне практыка-арыентаванага падыходу да падрыхтоўкі спецыялістаў у БДУКМ.

Вопыт работы творчых кафедр сведчыць, што фарміраванне прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў, развіццё матывацыі, цікавасці да адукацыйнай дзейнасці адбываецца больш эфектыўна, калі практыка-арыентаваныя дысцыпліны засвойваюцца ва ўмовах вучэбных творчых калектываў, майстэрняў. Так, на кафедры тэатральнай творчасці паспяхова функцыянуюць тэатр-студыя «7 паверх», тэатральная майстэрня «Студыёзы», на кафедры рэжысуры абрадаў і свят – тэатр «ФолькАрт», тэатр гульні «Белая Русь», на кафедры этналогіі і фальклору – калектывы «Талака», «Раме», «Этнасуполка», «Страла», «Агнявец», на кафедры харэаграфіі – ансамбль кафедры харэаграфіі, «Майстэрня эстраднага танца», праект M. Y. D. C. На кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва створаны своеасаблівыя майстэрні па розных напрамках ДПМ. Шырока вядомы творчыя калектывы факультэта музычнага мастацтва – ансамблі «Валачобнікі», «Туцці», «Грамніцы», «Баламуты», «Гуды», эстрадна-сімфанічны аркестр «Светач», хары «Віват», «Дабравест» і інш. Усе формы прамежкавай і выніковай атэстацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на такіх кафедрах праходзяць у форме творчых паказаў (канцэрты, спектаклі, выставы) і ацэньваюцца не толькі выкладчыкамі, але і шырокай грамадскасцю. Засваенне вучэбных дысцыплін у такім фармаце спрыяе ўзмацненню інтэгратыўных сувязей, фарміраванню ў студэнта цэласнага ўяўлення аб будучай прафесіі.

Перспектыўным кірункам у развіцці практыка-арыентаванай адукацыі з'яўляецца арганізацыя навучальнага працэсу на базах філіялаў кафедр (Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі і інш.), што абумоўлівае актыўнае ўключэнне студэнтаў у сумесную дзейнасць з вядучымі практыкамі.

Найважнейшы сродак рэалізацыі разгледжанага падыходу – набыццё прафесійнага вопыту падчас вучэбна-азнаямляльнай, вучэбнай, вытворчай, педагагічнай і пераддыпломнай практыкі.

Эфектыўнасць усіх відаў практыкі забяспечвае ўзаемасувязь і ўзаемапранікненне педагагічных сродкаў падрыхтоўкі ва УВА і ў перыяд практычнай дзейнасці, што азначае:

– развіццё, прымяненне і ацэнку кампетэнцый, якія фарміруюцца ў студэнтаў, падбор адпаведных практычных заданняў, выкананне іх у перыяд навучання і падчас практыкі;

– праверку тэарэтычных, метадычных, спецыяльных ведаў на канкрэтных фактах, даследаванне новых бакоў вывучаемых з'яў;

– актуалізацыю раней засвоеных ведаў, спосабаў дзейнасці, якія неабходны для вырашэння пастаўленых перад студэнтамі практычных задач;

– набыццё ведаў, спосабаў дзеяння, крыніцай якіх з'яўляецца ўласная дзейнасць студэнтаў;

– вывучэнне тэарэтычных аспектаў, а таксама ўсведамленне кампетэнцый, якія неабходна фарміраваць у працэсе далейшага навучання (апераджальны прынцып).

Варта адзначыць, што практыка-арыентаваны падыход пры выкладанні спецыяльных дысцыплін на кафедрах будуецца на выкарыстанні сістэмы практычных заданняў, якія распрацоўваюцца і зацвярджаюцца кожнай кафедрай. Структура практычных заданняў развіваецца і ўскладняецца ў залежнасці ад мэт і задач кожнага этапу навучання, узроўню падрыхтоўкі студэнтаў.

Прадуктыўнасць прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у сферы культуры і мастацтва павышаецца, калі практычная дзейнасць набывае даследчы характар. Выкананне даследчых заданняў становіцца асновай самастойнай навуковай працы – курсавых і дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У перыяд практыкі ажыццяўляецца збор матэрыялаў для выканання курсавых і кваліфікацыйных работ.

Практыка-арыентаваны падыход паспяхова рэалізуецца пры ўмове цеснага ўзаемадзеяння ўсіх структур, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы кадраў для сферы культуры (каледжаў, УВА, адукацыйных арганізацый усіх узроўняў), і патэнцыяльных работадаўцаў. Аб эфектыўнасці работы БДУКМ сведчаць заключаныя дагаворы з базавымі арганізацыямі – 57 вядучымі ўстановамі культуры, сярод якіх Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр, Маладзёжны тэатр эстрады, Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь, дзіцячая харэаграфічная школа № 1, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і інш.

Мэтай любога ўзаемадзеяння з'яўляюцца ўзаемаўзбагачэнне, узаемаўплыў, якія стымулююць развіццё абодвух бакоў. Названыя працэсы асабліва ярка выяўляюцца пры сувязі навукі і практыкі, у прыватнасці выкладчыкаў, студэнтаў БДУКМ і супрацоўнікаў базавых арганізацый (рэжысёраў, харэографаў, мастакоў). Дзякуючы практыцы студэнты набываюць вопыт прафесійнай дзейнасці, у іх фарміруецца комплекс асноўных кампетэнцый. Адначасова ўзаемадзеянне супрацоўнікаў базавых арганізацый са студэнтамі стымулюе прафесійны рост творчых работнікаў. Будучыя спецыялісты ў сферы культуры і мастацтва ставяць перад імі новыя задачы, прапануюць нестандартныя ідэі, метадычныя рашэнні, якія набыты на занятках ва УВА. Кіраўніку ўстановы культуры часам складана забяспечыць інавацыйнае развіццё ўстановы, калі ён не абапіраецца на дасягненні навукі, калі не адбываецца ўзаемадзеянне з прадстаўнікамі навучальных устаноў, вядучымі навукоўцамі, якія распрацоўваюць перспектывы развіцця культуры і мастацтва ў краіне. У сваю чаргу менавіта супрацоўнікі ўстаноў культуры выяўляюць і актуалізуюць тыя праблемы, якія патрабуюць навуковага абгрунтавання і рашэння. Дзякуючы запытам спецыялістаў-практыкаў вызначаюцца найбольш значныя і прыярытэтныя напрамкі навукова-даследчай дзейнасці ва УВА.

Вялікую ролю ў рэалізацыі практыка-арыентаванага падыходу ў навучанні адыгрываюць агульнаўніверсітэцкія творчыя праекты «Дуброўскі», «Казанова», «Сем таямніц Беларусі», удзел студэнтаў у мерапрыемствах, арганізаваных прадзюсарскім цэнтрам «Арт-мажор». Сёння мы маем спецыяльныя пляцоўкі, своеасаблівыя творчыя інкубатары, якія дазваляюць рэалізаваць практыка-арыентаванае навучанне пры ўдзеле прафесіяналаў найвышэйшага ўзроўню. У выніку паспяхова складваецца вытворча-творчы ланцужок: *выкладчыкі → прафесіяналы-практыкі → студэнты-выканаўцы → канкрэтны вынік*.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Менавіта ва ўмовах працы над сумеснымі праектамі засваенне навучальных дысцыплін адбываецца найбольш плённа, паколькі паэтапны, паслядоўны цыкл аналізуецца і кантралюецца не толькі прафесіяналамі-практыкамі, педагогамі, самімі студэнтамі, але і гледачамі, што дазваляе ў выніку ўбачыць і адчуць на завяршальнай фазе працы ступень яе суразмернасці і ўнутранай арганізаванасці. Акрамя таго, такія праекты даюць студэнтам магчымасць удасканалення не толькі асабістых прафесійных якасцей, але і пазнанне творчай індывідуальнасці іншых студэнтаў, прычым не толькі па ўнутрана замкнёнай рамкамі курса або кафедры гарызанталі (сваіх сакурснікаў) або па вертыкалі (студэнтаў старэйшых і малодшых курсаў), але і значна шырэй – студэнт вучыцца ўзаемадзейнічаць са студэнтамі іншых кафедр і факультэтаў. Такім чынам, ва УВА фарміруюцца ўстойлівыя прафесійныя сувязі, што, безумоўна, знаходзіцца ў рэчышчы практыка-арыентаванага падыходу да навучання і спрыяльна адбіваецца на далейшай прафесійнай дзейнасці выпускнікоў.

Разам з тым варта адзначыць праблемы, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні практыка-арыентаванага навучання ў БДУКМ:

– захаванне ў частцы прафесарска-выкладчыцкага складу стэрэатыпу мыслення па арганізацыі навучання, арыентаванага на традыцыйную тэхналогію перадачы ведаў. Асноўным зместам дзейнасці выкладчыка і студэнта з’яўляецца ўзнаўленне і трансляцыя тэкстаў, набору ведаў, уменняў, навыкаў, сабраных у вучэбныя праграмы і вучэбныя прадметы. Выкладчык у такой сітуацыі вырашае пытанні аб форме як мага больш сціслага выкладу аб’ёмнага і складанага для ўспрымання матэрыялу. Ствараецца ўражанне, што ён шчыра верыць, што без гэтых ведаў выпускнік не зможа ажыццяўляць усвядомленай прафесійнай актыўнасці. Задачай студэнта ў такім варыянце навучання становіцца злучэнне матэрыялу ў блокі, а блокаў у пэўную цэласную структуру. Заканамерна ў сувязі з гэтым паўстае задача пераносу атрыманых тэарэтычных ведаў і ўменняў у паўсядзённую прафесійную практыку. Такую задачу навучэнец выконвае ва ўмовах рэгламентаванай перадачы гатовага, адчужанага ад дынамікі развіцця культуры матэрыялу ў выглядзе «ўпакаванай» знакавай сістэмы, вырванай з кантэксту будучай самастойнай дзейнасці і актуальных сэнсаў самой асобы. Мы не лічым такую тэхналогію навучання эфектыўнай і настойваем на тым, што базай для развіцця прафесіяналізму можа стаць механізм узаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, вызначаны менавіта дзейнаснымі адносінамі;

– у выкладанні няпрофільных дысцыплін не заўсёды выкарыстоўваюцца метады прафесійна накіраванага (кантэкставага) вывучэння дысцыплін. Для фарміравання асобы спецыяліста ва УВА неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізаваць такое навучанне, якое забяспечыць пераход, трансфармацыю аднаго тыпу дзейнасці (пазнавальны) у іншы (прафесійны) з адпаведнай зменай патрэб і матываў, мэт, дзеянняў (учынкаў), сродкаў, прадметаў і вынікаў;

– невыпускаючыя кафедры часта не маюць уяўлення аб планах і мерапрыемствах выпускаючых кафедр па пошуку і стымуляванні таленавітых студэнтаў, не заўсёды спрыяюць павышэнню матывававанасці да навучання.

У заключэнні падкрэслім, што рэалізацыя практыка-арыентаванага падыходу ў БДУКМ з'яўляецца канкурэнтнай перавагай універсітэта на рынку адукацыйных паслуг і працы ў барацьбе за адораных абітурыентаў і стратэгічных партнёраў-работадаўцаў. Актыўнае ўзаемадзеянне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з органамі кіравання культурай, іншымі адукацыйнымі ўстановамі, спецыялістамі-практыкамі, работадаўцамі ў цэлым вызначае інавацыйны напрамак у сферы развіцця культуры краіны.

*1.* Активные и интерактивные образовательные технологии (формы проведения занятий) в высшей школе : учеб. пособие / сост. Т. Г. Мухина. – Н. Новгород : ННГАСУ, 2013. – 97 с.

*2. Беспалько, В. П.* Педагогика и прогрессивные технологии обучения / В. П. Беспалько. – М. : Ин-т профессионального образования МО России, 1995. – 336 с.

*3. Вербицкий, А. А.* Проблемы проектно-контекстной подготовки специалиста / А. А. Вербицкий // Высшее образование сегодня. – 2015. – № 4. – С. 2–8.

*4. Ветров, Ю.* Практико-ориентированный подход / Ю. Ветров, Н. Клушина // Высшее образование в России. – 2002. – № 6. – С. 43–46.

*5. Дмитриенко, Т. А.* Профессионально-ориентированные технологии в системе высшего педагогического образования как педагогическая проблема / Т. А. Дмитриенко // Alma Mater. – 2002. – № 7. – С. 55–56.

*6.* Интеграционные процессы и гуманитарные технологии : междисциплинарный аспект исследования научного образования в европейских университетах : науч.-метод. материалы / В. И. Богословский [и др.] ; под ред. А. П. Тряпицына. – СПб. : Книжный дом, 2007. – 272 с.

*7. Панфилова, А. П.* Инновационные педагогические технологии : Активное обучение : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / А. П. Панфилова. – М. : Академия, 2009. – 192 с.

*8. Просалова, В. С.* Концепция внедрения практико-ориентированного подхода [Электронный ресурс] / В. С. Просалова // Науковедение. – 2013. – № 3 (16). – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/kontseptsiya-vnedreniya-praktikoorientirovannogo-podhoda. – Дата доступа: 17.02.2018.

*9. Селевко, Г. К.* Традиционная педагогическая технология и ее гуманистическая модернизация / Г. К. Селевко. – М. : НИИ шк. технологий, 2005. – 144 с. – (Энциклопедия образовательных технологий).

*10. Солянкина, Л. Е.* Профессиональная компетентность специалиста как практико-ориентированный конструкт: психолого-акмеологический аспект : моногр. / Л. Е. Солянкина. – Тамбов : ТГУ им. Г. Р. Державина, 2010. – 196 с.

*11. Ялалов, Ф.* Деятельностно-компетентностный подход к практико-ориентированному образованию / Ф. Ялалов // Высшее образование в России. – 2008. – № 1. – С. 89–93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*A.Korbut*

**Features of practice-oriented training implementation in the Belarusian State University of Culture and Arts**

*The processes of domestic higher education's reformation on the example of the Belarusian State University of Culture and Arts are considered, the role of practice-oriented learning in training of specialists, competitive in today's job market, is emphasizes. It is noted that the graduates of the Belarusian State University of Culture and Arts have the unique opportunity to apply their knowledge in practice in the best institutions of the country.*

*The relevance of the chosen topic is revealed, scientific approaches to the practice-oriented training, developed in pedagogy, are analyzed.*

*Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 28.04.2018.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ